музея БССР у 1958 г. у с. Лемяшэвічы Брэсцкай вобласці. Царква Ражства Багародзіцы у в. Лемяшэвічы пабудавана ў 1885 г. з дрэва. Можа, царская брама была сюды перанесена са старой царквы, а можа, была зроблена як часовая менавіта для гэтай. Другая царская брама выяўлена ў в. Вавулічы, дзе мелася таксама царква Ражства Багародзіцы, пабудаваная ў 1737 г. з дрэва і перабудаваная пасля 1845 г. Гэты факт дае падставу меркаваць аб тым, што брама (ёсць звесткі, што і ўвесь іканастас у царкве быў саламяны) была зроблена, калі царква з уніяцкай стала праваслаўнай. Але дакладна гаварыць пра гэта можна толькі пасля дадатковай архіўнай працы.


1. *Лявонава А.К.* Старажытнабеларуская скульптура. — Мн., 1991. — 208 с.

2. *Марозава С.* Лёс культурнай спадчыны уніяцкай царквы ў Беларусі // Спадчына. — 1996. — № 6. — С. 100—118.

3. *Сахута Я.М.* Народнае мастацтва Беларусі. — Мн., 1997. — 287 с.

4. *Уния* в документах: Сб. / Сост. В.А. Теплова, З.И.Зуева. — Мн., 1997. — 250 с.

5. *Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. — Мн., 1985. — Т. 2. — 702 с.



С.В.Гілеўская,
*аспірантка*


## ВІДЫ РУЧНЫХ ТКАЦКІХ ПРЫЛАД І СТАНАЎ

Найбольш старажытным у народным мастацтве Беларусі з'яўляецца ткацтва. З даўніх часоў яно было любімым і неабходным заняткам сялянак, за гэтай справай яны праводзілі значную частку жыцця. І ўвесь час спявалі песні, прызначаныя для такой справы. Работа тады ішла спрытна і лёгка.

Ткацтва — працэс стварэння пластычнага матэрыялу прамавугольным перапляценнем нітак. Са старажытных часоў да сённяшняга дня сутнасць ткацтва не змянілася.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожная наступная механізацыя рамёстваў не змяніла асноўных прынцыпаў ткацтва.

Прататыпам ткацкага стана лічаць ткацкія дошчачкі з чатырма адтулінамі на вуглах. У адтуліны прапускалася аснова. Дошчачкі трымалі паралельна і шчыльна адна ля адной, каб зручней было адначасова паварочваць іх і такім чынам утвараць паслядоўныя зевы для ўтку. Дошчачкі былі аднолькавымі па памеры, тонкімі і гладкімі; звычайна іх выраблялі з дрэва, рога ці жорсткай скуры, пазней — з жорсткага кардону. Выраблялiся таксама шасцігранныя дошчачкі з шасцю адтулінамі [2, с. 95].

Сляды ткацкай тэхнікі на дошчачках знойдзены пры раскопках старажытных паселішчаў ад Кітая да Заходняй Еўропы. У пахаваннях I ст. да н. э. знойдзены тканыя на дошчачках стужкі, якія былі павязаны вакол галавы нябожчыкаў. Напалову сатканыя палоскі з 52 драўлянымі дошчачкамі знаходзіліся ў Нарвегіі ў пахаванні каралевы Асы, якая памерла каля 850 г. н. э. Самыя раннія рэшткі ткацтва на дошчачках, што захаваліся, — гэта егіпецкія, датуемыя паміж 945 і 745 гг. да н. э. Мяркуюць, што гэта рэшткі адзення, якое можна бачыць на егіпецкіх фрэсках 3000 г. да н. э. Ткацтвам на дошчачках займаліся і ў Паўночнай Афрыцы, дзе тканыя палоскі выкарыстоўваліся для дэкарыравання вупражы. Чырвоныя падвязкі грэчаскага нацыянальнага адзення выраблены таксама на дошчачках [4, с. 127].

У Беларусі ткацтва на дошчачках было распаўсюджана па ўсёй тэрыторыі, такія прыстасаванні выкарыстоўваліся ў пачатку XX ст. У вёсках яшчэ і сёння можна пабачыць тканыя паясы. Так, у в. Глядавічы Старадарожскага раёна ў адной з хат саматканыя рэчы перавязаны вузкім паяском шырынёй 2 см вельмі прыемнай бэжавай каларыстыкі.

Прымітыўнай прыладай ткацтва было таксама бердзечка. Гэта прамавугольная драўляная пласціна з ручкай або без яе, падзеленая папярочнымі шчылінамі на трасціны з адтулінамі пасярэдзіне. Цотныя ніткі асновы запраўляліся ў адтуліны, а няцотныя — у шчыліны. Зеў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

утвараўся, калі бердзечка падымалі ці апускалі. Пачатак нітак замацоўвалі на якім-небудзь нерухомым прадмеце, а канцы — на поясе ткачыхі. Бердзечка выкарыстоўвалі як асноўную частку маленькага ткацкага стана для вырабу паясоў або вузкай тканіны. У гэтым выпадку бердзечка магло быць рухомым, але магло быць і замацаваным у канструкцыі стана, тады трэба было падымаць і апускаць выраб. Найбольш старажытнае такое прыстасаванне знойдзена ў Пампеі, яно датуецца пачаткам нашай эры.

Некаторыя вучоныя лічаць, што ткацтву на гарызантальным стане папярэднічала ткацтва на ніту. У гэтым выпадку ніткі асновы падзяляюць на цотныя і няцотныя, і такім чынам утвараюць два слаі, адзін з якіх звязваюць пятлёй, а на другім вяжуць ніт — ніцяныя петлі, замацаваныя на палачцы.

Пералічаныя віды ручных ткацкіх прылад можна аднесці да паяснога ткацтва. Яно дазваляе тонка рэгуляваць нацяжэнне нітак, гэта магчыма таму, што ніткі замацоўваюць аднымі канцамі на нерухомым прадмеце, а другімі — на поясе ткачыхі. Такім чынам, калі ткачыха нахілялася наперад, аснова паслаблялася, а калі адхілялася назад, аснова нацягвалася.

Паяснос ткацтва можна лічыць папярэднікам гарызантальнага ткацкага стана. Увогуле лічаць, што існавалі два тыпы ткацкіх станаў, якія паслядоўна змянялі адзін аднаго: вертыкальны, больш старажытны, і гарызантальны. Даследчык В.І.Няелаў адзначае, што самае першае ткацтва выглядала так. Ніткі асновы, даўжынёй, некалькі большай за даўжыню будучага ткацкага вырабу, замацоўвалі зверху і знізу. Магчыма, што зверху для гэтага выкарыстоўвалі гарызантальныя галіны дрэў, а знізу — паваленыя ствалы, камяні, калочкі. Уточную нітку закладвалі паміж ніткамі асновы і прыбівалі да тканіны [2, с. 84]. Далейшае развіццё гэтай канструкцыі ўвасобілася ў раму.

Пазней у зямлю сталі ўбіваць дзве стойкі і злучалі іх папярэчынай, да якой падвязвалі ніткі асновы. Унізе да

канцоў асновы падвешвалі грузы. Уток пракладвалі палачкай [2, с. 84]. На ўдасканаленай канструкцыі вертыкальнага ткацкага стана зеваўтварэнне адбывалася пры дапамозе паўрэмізкі. Ніткі падзялялі на два слаі, адзін з якіх пад уздзеяннем грузаў свабодна звісаў, а другі агібаў ніжнюю папярэчыну стана са знешняга боку. Да нітак першага слою прымацоўвалі петлі з нітак, замацаваныя на палачцы. Для прыбівання нітак выкарыстоўвалі грэбень, што было ўжо значным удасканаленнем вертыкальнага стана. Пазней былі ўведзены ткацкія навоі: пражны і таварны. Вертыкальныя канструкцыі для ткацтва былі папярэднікамі габеленавых станаў. Але ў адрозненне ад сучасных ткацкіх станаў на першапачатковых канструкцыях ткалі не знізу ўверх, як зараз, а зверху ўніз [3, с. 376]. Даследчык В.І.Няёлаў мяркуе, што спачатку вертыкальныя станы былі прызначаны для выпрацоўкі ваўняных тканін, таму што льняныя ніткі не трымаліся б у зеве. Аднак на вертыкальным стане, дзе працавалі знізу ўверх, можна было перапрацоўваць любыя ніткі [2, с. 95].

Ткацтва на кругавой запраўцы асновы — таксама адно з найбольш старажытных. Тут маглі выкарыстоўваць два ці тры валы. Калі выкарыстоўвалі два валы, то яны маглі размяшчацца гарызантальна (так ткала тыбецкае племя тэбу) або вертыкальна (такія прыстасаванні выкарыстоўвалі ткачы Сірыі) [2, с. 85]. Практычнае прызначэнне канструкцыі з кругавой асновай — падоўжыць аснову без накручвання яе на навой, што, аднак, часта прыводзіла да нераўнамернасці нацяжэння асновы ў працэсе ткацтва. Ткацкі стан з кругавой асновай мог быць і паясным.

У Беларусі кругавую запраўку асновы выкарыстоўваюць зараз на вертыкальных ткацкіх станах для вырабу габеленаў. Каб аснову можна было перакруціць, у канструкцыі стана прадугледжаны палачкі, з дапамогай якіх нацяжэнне асновы можна аслабляць ці ўзмацняць.

Дастаткова прымітыўнае ўстройства першых гарызантальных станаў: аснову замацоўвалі на двух

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паралельных нерухомых брусах, усталяваных невысока над зямлёй. Уток перакідвалі з дапамогай чаўнака. Прыбівалі ўток драўляным ткацкім мячом. На стане вялікай шырыні працавалі два чалавекі. У Берлінскім музеі захоўваецца старажытнаегіпецкая тканіна шырынёй 140 см.

У Егіпце перыяду Новага царства вядомы тып стана, які злучаў у сабе рысы гарызантальнага стана і стана з грузамі. Стан усталёўвалі каля сцяны, на якой уверсе замацоўвалі валік. Праз валік перакідвалі вяроўку, на адзін канец якой падвешвалі груз, а другі прывязвалі да палкі. На палцы замацоўвалі ніткі асновы, якія такім чынам знаходзіліся пад пастаянным нацяжэннем. Велічыню груза падбіралі такой, каб ткач мог без асаблівых намаганняў накруціць тканіну на таварны валік. Для ткача рабілі месца на ўзроўні падлогі, адна нага яго знаходзілася на подлозе ці на спецыяльна пастаўленай для зручнасці нерухомай падножцы, другой нагой ён націскаў на панажы, якія знаходзіліся ў яме. Канструкцыі станаў з ямай для панажоў выкарыстоўваліся і індыйскімі ткачамі [2, с. 91].

Мяркуюць, што ўпершыню дзве злучаныя паўрэмізкі пачалі выкарыстоўваць у Кітаі на гарызантальным стане, адтуль яны прыйшлі ў Егіпет праз Пярэднюю Індыю і Іран. У ранніх канструкцыях станаў рэмізкі прыводзіліся ў рух нагой з дапамогай вяровачных петляў. Пазней з'явіліся панажы.

На рэмізным стане, якім мы карыстаемся зараз, дзве стойкі злучаны папярэчынамі і падтрымліваюць два валы (пражны і таварны), якія рухаюцца, і нерухомы грудны вал, перад якім звычайна робяць месца для ткача. На верхняй перакладзіне замацоўваюць зеваствральныя блокі для падвешвання на падвязках рэмізак. Пракладзены ўток прыбіваюць бердам, замацаваным на батане, вось якога звычайна знаходзіцца ў верхняй частцы стана.

Вядома шмат варыянтаў гэтага асноўнага тыпу ручнога ткацкага стана. Ва Усходняй Еўропе апорнымі часткамі канструкцыі стана часта служылі сцены і дах пабудовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнай перавагай рэмізнага стана была магчымасць вырабляць доўгія тканіны. Акрамя таго, рэмізны стан быў больш прадукцыйны за іншыя тыпы станаў, таму што вызваляў рухі ткача ад аперацыі ўтварэння зева. Ткацкія станы, што існавалі ў Беларусі, даследчык Г.М.Курыловіч класіфікуе наступным чынам: "на сохах", "са ставамі", "рамны", "варштат" [1, с. 46]. Найбольш старажытны і прымітыўны стан станіны не меў, абодва навоі мацаваліся на слупках, зробленых з частак дрэў і ўкапаных ў земляную падлогу развілкай уверх. Рэмізкі і батан з дапамогай доўгіх вяровак-"паднебнікаў" мацаваліся да столі.

Больш удасканалены ткацкі стан са ставамі ("стаціваш"). У ім ужо закладзены пачатак станіны. Пражны навой клалі на лаўку каля сцяны і прывязвалі к дужкам, убітым у сцяну, або мацавалі на невялікіх рагульках, размешчаных на ставах.

Рамны ткацкі стан меў чатыры апоры, якія злучаліся ў ніжняй частцы папярэчынамі і ўтваралі апорную раму.

Варштат — гэта найбольш удасканалены ткацкі стан, які мае трывалую станіну, што дазваляе рэгуляваць нацяжэнне нітак асновы і дабівацца найбольш раўнамернай шчыльнасці тканіны.

У кожнай мясцовасці ткацкі стан называлі па-рознаму: "кросны", "варштат", "стан", часта назва не адпавядала канструкцыі. Напрыклад, у Старадарожскім раёне ў в. Шапчыцы ткацкі стан называлі кроснамі, а ў тым жа раёне ў в. Глядавічы — варштатам, а кросны тут — гэта сама тканіна, якую ткуць. Змешванне тэрмінаў адзначае і даследчык Г.М.Курыловіч [1, с. 49].

Беларускае народнае ткацтва — частка агульнасусветнага мастацтва. Узнікненне і развіццё ткацтва абумоўлена ўзроўнем развіцця грамадства, прыроднымі, сацыяльнымі, эканамічнымі ўмовамі. Узнікненне пэўных канструкцый станаў залежыць ад сыравіны, кліматычных умоў і ладу жыцця народа. Першапачатковыя канструкцыі змянялі, прыстасоўвалі да пэўнага асяроддзя, але ткацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ва ўсім свеце мае агульныя карані, і прынцып ткацтва застаецца нязменным.

---

1. *Курыловіч Г.М.* Ткацкі стан // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. — Мн., 1989. — С. 495—497.

2. *Неелов В.И.* Ткачество: от плетельных рам до многозевных машин. — М., 1986. — 170 с.

3. *Hand weaving* // Encyclopaedia Britannica: In 24 vol. Volume 23. — Chicago; London; Toronto, 1962. — P. 375—378.

4. *Weaving* // Enciclopaedia of Crafts. — London, 1978. — P. 215—230.

Г.М.Водчыц,
*аспірантка*

## СТВАРЭННЕ СЦЭНІЧНАЙ ХАРЭАГРАФІІ НА АСНОВЕ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ ТВОРАЎ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з найбольш складаных і вострых праблем сучаснага харэаграфічнага мастацтва з'яўляецца праблема стварэння арыгінальнага рэпертуару. Гэта патрабуе пашырэння кола крыніц, у тым ліку нехарэаграфічных, для стварэння харэаграфічных нумароў. У такім сэнсе беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва выкарыстоўваецца ў якасці ўскоснай крыніцы побач з народнай музыкай і песняй, казкай і паданнем, гульнямі і тэатральнымі дзеяннямі, традыцыямі і абрадамі. Аб прамым пераносе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў харэаграфію гаварыць не даводзіцца ўжо хаця б таму, што яны аперыруюць своеасаблівымі сістэмамі сродкаў выразнасці. У творах прыкладнога мастацтва — гэта форма, колер, фактура, кампазіцыйная пабудова. У харэаграфіі — рух, малюнак танца, пластыка, поза, харэаграфічны вобраз, драматургічнае развіццё. У сувязі з гэтым пры пераносе твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў харэаграфію адбываецца працэс інтэрпрэтацыі, творчае